Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 258 (327)
ЧАЦВЕР 7 ЛІСТАПАДА 1940 г.

Цана 10 капеек.

Няхай жыве XXIII гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў СССР!

Братам па класу, вязням капітала, барацьбітам за вызваленне рабочага класа ва ўсім свеце -- наша брацкае прывітанне!

(З лозунгаў ЦК ВКП(б) да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі).

НЯХАЙ ЖЫВЕ БРАЦКІ САЮЗ І ДРУЖБА НАРОДАЎ СОВЕЦКАГА САЮЗА!



Вялікая ўрачыстасць

Вызваленыя ў верасні мінулага года ад іга капіталістаў і памешчыкаў, капіталістычнай эксплаатацыі і нацыянальнага прыгнечання народы заходніх абласцей БССР у другі раз свабодна і радасна святкуюць слаўную гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Яны ўрачыста дэманструюць сваю згуртаванасць вакол совецкай улады, комуністычнай партыі, правадыра народаў таварыша Сталіна, сваю гатоўнасць да канца змагацца за пабудову комуністычнага грамадства.

У гэтыя ўрачыстыя дні ўсе народы вялікай краіны соцыялізма, з'яднаныя адзінай творчай комуністычнай працай, вялікімі ідэямі Леніна — Сталіна, праводзяць агляд праробленай работы. Мінуў год, а які гіганцкі крок зроблен па шляху да комунізма! Натхнёныя вялікімі ўказаннямі таварыша Сталіна, гордыя пабудовай узвышаючагася светлага будынка соцыялізма, народы Совецкага Саюза з сцягам Леніна—Сталіна, з сцягам соцыялістычнай рэволюцыі няўхільна і ўпэўнена ідуць уперад, да новых перамог.

Сёння варта аглянуцца на тое, што сабой прадстаўляла прамысловасць Беластоцкай абласці пры панаванні польскіх капіталістаў. Існавалі маленькія, поўсаматужныя прадпрыемствы. Напрыклад, на 11 тэкстыльных фабрыках, якія належалі групе капіталістаў, працавала рабочых ад 23 да 58 чалавек. Не было ніякіх клопатаў аб ахове працы, аб стварэнні належных умоў для працуючых. Сёння гэтыя фабрыкі рэканструіраваны, аб'еднаны ў 1-шы тэкстыльны камбінат. На ім працуе 1206 чалавек. Але галоўнае ў тым, што назаўсёды знішчана панаванне эксплаататараў - капіталістаў. Фабрыкі сталі ўсенародным здабыткам. Рабочы клас сам наладжвае і кіруе соцыялістычнай вытворчасцю. Назаўсёды ліквідавана беспрацоўе, залежнасць рабочых ад капрызаў капіталіста.. Назаўсёды знішчана рабскае, бяспраўнае становішча вытворцаў грамадскага багацця.

Шырока разгорнутае соцыялістычнае спаборніцтва, стаханаўская праца ўзнялі свядомасць людзей. Рабочыя працу на соцыялістычных прадпрыемствах разглядаюць як працу на сябе, на вялікі совецкі народ.

Той вялікі вытворчы ўздым, які паўсядзённа ўзрастае на прадпрыемствах нашай прамысловасці, сведчыць, што даброты Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі высока ўзнялі годнасць рабочага чалавека, парадзілі нязгасную радасць працы, вытворчы энтузіязм. Пераклічка па радыё паміж тэкстыльшчыкамі Беластока і Масквы, стэнаграма якой надрукавана ў нашай газеце за 5 лістапада, красамоўна сцвярджае, што рабочыя Беластока ідуць нага ў нагу, плячо к плячу з рабочымі Масквы—сэрца нашай квітнеючай радзімы.

Няма ніводнай галіны народнай гаспадаркі і культуры нашай абласці, дзе-б за гэты год не адбыліся карэнныя змены, дзе-б вызваленыя народы не паказалі свайго творчага будаўнічага размаху.

Другі прыклад — сельская гаспадарка. У панскай Польшчы ўся лепшая зямля, воды, лясы належалі памешчыкам. Так, у Пінскай абласці 206 памешчыкаў уладалі 494 тысячамі гектараў зямлі, а 86 тысяч сялянскіх гаспадарак — 737 тысячамі. Прыкладна такое становішча было і ў іншых абласцях. Працоўнае сялянства пераносіла неймаверную галечу і нястачу. Толькі совецкая ўлада вызваліла працоўнае сялянства ад памешчыкаў і кулакоў, стварыла ўсе ўмовы для свабоднага, шчаслівага жыцця. Землі, якія належалі памешчыкам, царквам, чыноўнікам, перададзены бясплатна ў карыстанне сялянства. Па ўласнаму жаданню перадавых сялян у абласці створана 164 калгасы, у якія аб'еднаны больш 7 тысяч гаспадарак. 24 машынна-трактарных станцыі заклікаңы сваёй тэхнікай дапамагчы працоўнаму сялянству перабудаваць жыццё па-новаму. Створана 9 соўгасаў.

Як на прадпрыемствах, так і ў калгасах і соўгасах абласці растуць новыя людзі, наватары соцыялістычнай працы. Такія імёны, як Меламед, Тыкоцкі, Бэз — стаханаўцы-чатырохстаночнікі, Якімовіч — брыгадзір калгаса «Новае жыццё», Сапоцкінскага раёна, Літман — калгасніца-стаханаўка калгаса «1 Мая», Монькаўскага раёна, і многа іншых—становяцца вядомымі як знатныя людзі абласці.

Датэрміновае выкананне гадавой праграмы 2-м тэкстыльным камбінатам, 8-м камбінатам, набліжэнне да выканання гадавой праграмы 13-га тэкстыльнага камбіната і т. д. гаворыць аб тым, што тэкстыльшчыкі Беластока па-бальшэвіцку змагаюцца за выкананне пастаўленай імі задачы—ператварыць Беласток у другое Іванава.

Выдучэнне лепшых сыноў народа — партыйных і непартыйных бальшэвікоў кандыдатамі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, шырокае разгортванне перадвыбарчай работы суправаджаецца вытворчым уздымам і прадстаўляе сабой бальшэвіцкую дэманстрацыю нерушымага маральна-палітычнага адзінства народа. Жыватворныя праменні Сталінскай Канстытуцыі жывяць глебу растучай грамадскай і дзяржаўнай актыўнасці шырокіх слаёў працоўных усіх нацыянальнасцей. Пачуццё інтэрнацыяналізма становіцца характэрным для работнікаў прадпрыемстваў ,калгасаў, соўгасаў і ўстаноў. Адыходзіць у нябыт нацыянальная непрыязнь, якая культывіравалася прыгнятальнікамі—памешчыкамі і капіталістамі ў панскай Польшчы.

«Роўнапраўе грамадзян СССР, незалежна ад іх нацыянальнасці і расы, ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця з'яўляецца непарушным законам. Якое-б та ні было прамое або ўскоснае абмежаванне правоў або, наадварот, устанаўленне прамых або ўскосных пераваг грамадзян у залежнасці ад іх расавай нацыянальнай прыналежнасці, таксама як усякая прэпаведзь расавай або нацыянальнай выключнасці, або нянавісці і пагарды—караюцца законам». Гэтыя велізарнейшага значэння словы сталінскага закона, якія фіксіруюць вялікія заваёвы Кастрычніка, высока ўзнімаюць чэсць грамадзяніна СССР. Кожны грамадзянін СССР усім сваім жыццём будзе адстойваць ад усякіх ворагаў недатыкальнасць граніц сваёй дарагой радзімы. Гэта ёсць вышэйшы абавязак кожнага совецкага патрыёта.

Вялікая партыя Леніна — Сталіна ў лозунгах Цэнтральнага Камітэта да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі дала праграму далейшай барацьбы за ўмацаванне і развіццё соцыялістычнай гаспадаркі і рост соцыялістычнай культуры. І народ вялікай краіны соцыялізма іх прыняў, як кіраўніцтва да дзеяння, каб пад вялікім сцягам партыі Леніна—Сталіна ісці наперад да заваявання новых перамог.

Няхай жыве XXIII гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў СССР!

Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная партыя (бальшэвікоў)— перадавы атрад працоўных Совецкага Саюза!

Няхай жыве правадыр народаў усяго свету вялікі СТАЛІН!

Наша жыццё поўна радасці і шчасця

Спаборніцтва ўзнікла ў нас як песня вызваленага чалавека, у якога праца стала радасцю. Ды і як не радавацца нам — тэкстыльшчыкам Беластока, калі па-новаму пачалося наша жыццё. Другімі сталі людзі. Змяніліся фабрыкі. Аб старых фабрыках цяпер напамінаюць толькі старыя корпусы.

Якімі-ж былі фабрыкі пры капіталістах?

Мы працавалі ў цёмных, брудных, халодных корпусах. Улетку горача, душна, дыхаць няма чым (аб вентыляцыі мы і не чулі), вады няма. Фабрыкі працавалі толькі сезонна. Астатні час рабочыя былі беспрацоўнымі. Дапамогу па беспрацоўю атрымліваў толькі той, хто праpрацаваў 156 дзён. Не хопіць дня, і дапамогі не атрымаеш. А калі хто захварэе, дык папросіць суседку заняць яе машыны месца, каб адпрацаваць свае дні. І суседкі «выручалі». Сама пойдзе дадому, а за яе другая працуе і ёйжа грошы плоціць.

Я, перш чым стаць да машыны, падмятала падлогу, насіла роўніцу. І толькі пасля гэтага мяне пускалі к машыне.

Пры фабрыкантах не было ткачых, а цяпер жанчыны вучацца ткацкай справе. Жанчыны сталі вучыцца і набылі прафесію. Матальшчыца Шыткоўская стала бракаўшчыцай, снавальшчыца Зіна Клейф — начальнікам аддзела кадраў.

У снежні 1939 года да нас з Масквы прыехала дэлегацыя тэкстыльшчыкаў «Трохгорнай мануфактуры», і мы з імі заключылі дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва. Дагавор падпісалі — значыць трэба яго выконваць. Але дагавор можна выканаць толькі тады, калі кожны рабочы будзе адчуваць адказнасць за ўзятае абавязацельства. Я заключыла дагавор са сваёй зменшчыцай Шчэдрук. Работа пайшла добра. Стараліся, каб машына лішняй мінуты не стаяла. Змена за зменай сачылі.

Мы абавязаліся даваць па 71 кілограму ў дзень, а давалі па 90. Уключыўшыся ў перадмайскае спаборніцтва, я заявіла, што жадаю перайсці на абслугоўванне двух машын. Дырэкцыя пайшла мне насустрач, і я стала з тых пор працаваць на двух машынах. Некаторыя прадзільшчыцы гаварылі: «Калі Пятроўская можа на двух машынах працаваць, то і мы таксама адставаць не будзем». І многія пачалі працаваць на двух машынах.

Сёння я хачу сказаць: Дзякуй совецкай уладзе, дзякуй таварышу Сталіну за жыццё, поўнае радасці і шчасця!

М. Пятроўская,
прадзільшчыца 1-га камбіната, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

Вытворчымі падарункамі рабочыя сустрэлі вялікае свята

Выдатных вынікаў да слаўнай гадавіны дабіўся калектыў 2-га тэкстыльнага камбіната, выканаўшы гадавую вытворчую праграму да 2-га лістапада. Выпушчана 1341 тысяча метраў тканіны.

І пасля выканання гадавога плана калектыў камбіната не здае ўзятых тэмпаў. 4 лістапада апаратна-прадзільны цэх выканаў сваё заданне на 111,2 процанта, ткацкі —на 106 процантаў. За першыя тры дні лістапада выпушчаны 19 тысяч метраў тканіны, што складае 130 процантаў плана. Першасортнай прадукцыі выпушчана 90 процантаў, замест 87 па плану.

* * *

Калектыў беластоцкага чыгуналіцейнага завода з месяца ў месяц перавыконвае сваё заданне. У кастрычніку праграма была выканана на 168 процантаў. Кастрычнік у параўнанні з жніўнем даў рост прадукцыйнасці працы на 22 проценты, а ў параўнанні з сакавіком — на 180 процантаў. Лепшых поспехаў дабіліся ліцейшчыкі Дайліда, Міхал і Станіслаў. Апошні дае сістэматычна па 2 нормы. Фармаўшчык В. Багусловіч выконвае план на 155 процантаў. Цэхі завода рамантуюцца, праводзіцца рэканструкцыйная работа.

* * *

Высокімі паказчыкамі ў сваёй рабоце сустрэў XXIII гадавіну Вялікага Кастрычніка калектыў апаратна-прадзільнага цэха 6-га тэкстыльнага камбіната. У кастрычніку гэты цэх выканаў свой план на 112,1 процанта. 88 процантаў усяго саставу работніц апаратна-прадзільнага цэха асвоілі норму выпрацоўкі і перавыконваюць яе. Лепшых рэзультатаў дабілася прысучальшчыца Вера Ранека, вылучаная кандыдатам у дэпутаты горсовета. Яна сістэматычна выконвае план на 107 процантаў.

* * *

З вялікімі вытворчымі перамогамі сустрэў слаўную гадавіну калектыў 13-га тэкстыльнага камбіната. Яшчэ 27 кастрычніка камбінат выканаў гадавы план па выпуску пражы. На 5 лістапада план па выпуску гатовай прадукцыі выканан на 99,4 процанта.

Значных поспехаў дабіўся калектыў у асваенні норм выпрацоўкі. 93 проценты з агульнага ліку здзельшчыкаў асвоілі нормы выпрацоўкі.

Выдатных паказчыкаў дабіліся ткачы-двухстаночнікі тт. Гельштэйн Амельянюк. Яны выконваюць план на 125 проц. Добра працуюць таксама і прадзільшчыцы Камінская і Омельянюк. Яны выконваюць план на 125 процантаў. Матальшчыца тав. Шэйн, працуючы на 24 верацёнах, выконвае заданне на 121 процант.

Перавыканалі гадавыя вытворчыя планы

Калектыў Ломжынскага цагельнага завода № 4 выканаў гадавую вытворчую праграму на 120 процантаў.

Выпушчана звыш плана прадукцыі на 64 тысячы рублёў.

Члены швейна-трыкатажнай арцелі імені 29 верасня (Ломжа) сустрэлі слаўную гадавіну Вялікага Кастрычніка выкананнем гадавога плана на 127,8 процанта.

Арцель выпусціла прадукцыі звыш плана на 305 тысяч рублёў.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных

На нарадзе Цэнтральнай выбарчай акругі

5 лістапада адбылася прадвыбарчая нарада прадстаўнікоў прадпрыемстваў Цэнтральнай беластоцкай гарадской выбарчай акругі. Нараду адкрыў старшыня фабрычнага камітэта 6-га тэкстыльнага камбіната тав. Ішыбеляк. Пасля абрання дзелавога і пачотнага прэзідыума слова прадастаўляецца начальніку ткацкага цэха 6-га тэкстыльнага камбіната тав. Сацінай. Яна гаворыць аб жаданні калектыва камбіната аддаць свае галасы за непераможны блок комуністаў і беспартыйных. У кароткіх рысах яна спыняецца на жыццёвым шляху, пройдзеным кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета тав. Курыльскім Ізраілем Хацкелевічам, які вылучан калектывам 6-га тэкстыльнага камбіната.

На нарадзе прынят зварот да выбаршчыкаў Цэнтральнай выбарчай акругі, які заклікае выбаршчыкаў аддаць свае галасы за кандыдата народа І. Х. Курыльскага.

На перадвыбарчых сходах

ВАЎКАВЫСК. **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).** Радасныя і хвалюючыя дні перажываюць працоўныя Ваўкавыскага раёна. На прадпрыемствах, у калгасах і вёсках праходзяць многалюдныя мітынгі, прысвечаныя вылучэнню кандыдатаў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

З вялікім уздымам прайшоў выбарчы сход рабочых цэментнага завода «Рось», на якім прысутнічала 250 чалавек. Удзельнікі схода аднадушна паслалі кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета лепшага стаханаўца завода рабочага кар'ера Івана Пятровіча Чырвоніk. У раённы Совет сход вылучыў кандыдатам у дэпутаты комсамолку-стаханаўку завода Веру Васільеўну Верацiла.

У абедзены перапынак 4-га лістапада 450 рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў Ваўкавыскага дэпо сабраліся на перадвыбарчы сход. Па прапанове намесніка начальніка дэпо тав. Грыбава кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета вылучылі сакратара абкома партыі Аляксандра Іванавіча Шавалава. На гэтым-жа сходзе па прапанове машыніста дэпо тав. Кавалёва кандыдатам у дэпутаты раённага Совета вылучан тройчы ордэнаносец Сямён Васільевіч Бардзілаў.

На перадвыбарчым сходзе калгаса імені 17 верасня, Гудзевіцкага сельсовета, калгаснікі вылучылі сваім кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета старшыню гэтага калгаса Лесіка Аляксандра Іванавіча.

Старшыню перадавога сельсовета раёна, комсамолку Аляксандру Паўлаўну Улановіч калгаснікі калгаса імені Молатава вылучылі кандыдатам у дэпутаты раённага Совета.

Сяляне вёскі Плебанаўцы, Вальпянскага сельсовета, вылучылі сваім кандыдатам у дэпутаты раённага Совета селяніна-бедняка Гарбачэўскага Ігната Грыгор'евіча.

Д. Казлоў.

Кандыдаты народа

ЛОМЖА. **(Ад нашага карэспандэнта).** Працоўныя раёна на агульных сходах вылучаюць кандыдатаў у дэпутаты абласнога і раённага Советаў. На сходзе рабочых і служачых лесазавода № 2 выступіў начальнік лесацэха тав. Грыгорык Станіслаў з прапановай вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутата Вярхоўнага Совета СССР тав. Івана Антонавіча Турлейскага.

Сход аднагалосна пастанаўляе вылучыць тав. Турлейскага кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета па 15-й выбарчай акрузе.

На сходзе інтэлігенцыі горада Ломжы аднадушна кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета вылучан сакратар Беластоцкага абкома партыі тав. Філіп Іосіфавіч Папоў.

Сход рабочых завода сельскагаспадарчых машын у абласны Совет дэпутатаў працоўных сваім кандыдатам паслаў рабочага-ліцейшчыка тав. Франца Пятровіча Бураўскага.

П. Грышчанка.

Дружнай, плённай працай на дабро соцыялізма памножым багацце і абаронную магутнасць Совецкай краіны!



Група кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных, вылучаных калектывам плюшавай фабрыкі.

Фота А .Сапіра.

КОМУНІСТЫ—НА ЧАЛЕ МАС

На працягу некалькіх месяцаў пасля нацыяналізацыі буйнай прамысловасці на 6-ым беластоцкім тэкстыльным камбінаце працаваў толькі адзін комуніст—кандыдат партыі, дырэктар камбіната тав. М. І. Гімпельсон. У красавіку — чэрвені 1940 года прыбыла яшчэ некалькі кандыдатаў ВКП(б). Да верасня на камбінаце не было ні аднаго члена партыі, усю партыйна - палітычную работу праводзілі 7 кандыдатаў ВКП(б). Але-ж і гэтая невялікая група комуністаў правяла сярод рабочых выключна вялікую работу.

Рабочым і работніцам шырока растлумачаны рашэнні XVIII з'езда ВКП(б) і XVIII з'езда КП(б)Б. У цэхах праведзена каля 300 палітгутарак.

Асабліва многае зрабілі комуністы па аднаўленню запушчанага панамі прадпрыемства. Рацыяналізіраван увесь тэхналагічны працэс. Падабраны па кампдектах ткацкія станкі.

У выніку план першага паўгоддзя выканан на 126 процантаў, звыш плана дана 40 тысяч метраў сукна. Усё гэта зроблена пры меншай колькасці рабочых на 16 процантаў. За вытворчыя поспехі камбінат атрымаў у жніўні пераходны чырвоны сцяг гаркома КП(б)Б і горвыканкома.

На камбінат прышлі новыя комуністы. У пачатку верасня створана партыйная арганізацыя. З таго часу яшчэ шырэй разгарнулася на прадпрыемстве партыйна-палітычная работа.

Створан моцны агіткалектыў, у састаў якога ўвайшлі 30 лепшых рабочых і работніц. Яны добра вывучылі самі, а потым растлумачылі рабочым даклад таварыша Молатава на VII Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня.

Найбольш актыўна працуюць агітатары тт. Дзінабурская, Астралогава, Арсеньеў, Крэйндліна, Кавальская, Пшыбеляк, Пшывальская і іншыя. Член партыі тав. Дзінабурская адначасова з'яўляецца кіраўніком агіткалектыва.

З мэтай лепшага разгортвання масава - палітычнай работы сярод рабочых і работніц, сярод усіх выбаршчыкаў, партарганізацыя камбіната вялікую ўвагу ўдзяляе наладжванню партыйнай вучобы комуністаў. Дырэктар камбіната, кандыдат ВКП(б) тав. Гімпельсон кіруе гуртком па вывучэнню «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», у якім займаюцца 22 чалавекі — комуністы і беспартыйны актыў.

Толькі ў выніку добра разгорнутай палітыка-масавай работы парт-арганізацыя дабілася таго, што на камбінаце вырас беспартыйны актыў. На выбарчых участках у якасці членаў камісіі і агітатараў працуе звыш 70 рабочых і работніц. 34 рабочыя і работніцы вылучаны на кіруючую работу. Былая прадзільшчыца тав. Петранюк вылучана на пасаду начальніка аддзела кадраў, былы мыйшчык тав. Альшэўскі—на пасаду апрэтурнага майстра і т. д. На прадвыбарчым сходзе кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета вылучан лепшы стаханавец тав. І. Х. Курыльскі. Кандыдатамі ў дэпутаты горсовета вылучана 5 чалавек.

У выніку ажыццяўлення мерапрыемстваў партыйнай арганізацыі, у выніку добра разгорнутай масава-палітычнай работы 6-ты камбінат і ў трэцім квартале дабіўся нядрэнных поспехаў у выкананні плана і павышэнні якасці прадукцыі. План трэцяга квартала выканан на 114 процантаў, зверх плана дана краіне яшчэ 40 тысяч метраў тканіны. У кастрычніку пры падвоенай праграме план па валавой прадукцыі выканан на 121 процант.

Сёння рабочыя і работніцы, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя 6-га камбіната ў святочнай дэманстрацыі працоўных горада пойдуць першымі ў першай калоне беластоцкіх шарсцянікаў.

В. Дзям'янаў.

Па калгаснаму шляху

У 30 кілометрах ад Гродна, між стройных бярозавых і хвойных лясоў, размясцілася невялікая вёска Жорнаўка. Нямнотім больш года таму назад тут жыў памешчык Клімашэўскі. Выдатныя свірны, канюшні, кароўнікі — усё гэта належала яму. Яшчэ да ўсхода сонца маёнтак абуджаўся, гучэў грозны голас прыганятага. Працаваўшыя на пана не мелі сваёй зямлі. Беднасць і галеча былі вечнымі спадарожнікамі жорнаўскіх батракоў.

Так ішлі годы. Людзі стагналі пад панскім ярмом. Вякамі капілі людзі свой гнеў, сваю крыўду на эксплаататараў. Часамі гэты гнеў выбухаў наружу, і тады ў маёнтку пачынаўся «бунт». Батракі не выходзілі на работу, патрабуючы палепшання умоў жыцця. Бізуном уціхаміравалі «бунтаўшчыкоў».

Так было да 17 верасня 1939 года. Даведаўшыся аб пераходзе гераічнай Чырвонай Арміяй граніцы былой панскай Польшчы, жорнаўцы ішлі ў лясы, арганізоўваліся ў партызанскія атрады. Чырвоных воінаў жорнаўцы сустрэлі, як родных братоў.

У адзін з красавіцкіх дзён у кабінет старшыні райвыканкома прышлі некалькі сялян.

— Мы з маёнтка Клімашэўскага, — сказаў адзін з іх. — Прышлі да вас, таварыш, каб вы прыслалі прадстаўніка, які расказаў-бы нам аб калгасе і калгасным жыцці. Жадаем быць калгаснікамі.

У гэтым-жа месяцы ў Жорнаўцы арганізаваўся калгас «Свабодная Беларусь». Трыццаць былых батракоў цвёрда сталі на калгасны шлях. Вясеннія палявыя работы жорнаўцы праводзілі калектыўна.

Шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва. Лепшыя людзі калгаса Сцяпан Улейка, Міхаіл Янушка, Станіслаў Манцэвіч і іншыя паказвалі ўзоры работы на калгасных палях. Яны выконвалі свае нормы на 150 і больш процантаў.

Паспяхова прайшла ўборка ўраджаю. Адначасова з уборкай калгаснікі арганізавалі малацьбу і здачу збожжа дзяржаве. Калгас своечасова закончыў усе сельскагаспадарчыя работы і выканаў абавязацельствы перад дзяржавай.

Ударная стаханаўская праца дала свае рэзультаты. Зямля шчодра аплаціла працу калгаснікаў. З кожнага гектара калгас зняў па 80 пудоў жыта, 60 пудоў пшаніцы, па 1.200 пудоў бульбы. Сабралі таксама высокі ўраджай аўсу, ячменю, канюшыны, гароднін. Калгас засыпаў насенныя, страхавыя і фуражныя фонды.

Калгасны працадзень важыць: зярна—9 кілограмаў, бульбы—19 кілограмаў, гародніны — 1 кілограм, сена — 6 кілограмаў, саломы — 10 кілограмаў. Грошай прыпадае па 2 рублі на працадзень.

Мінула галеча і нястача. У вёску Жорнаўку прышло новае, заможнае жыццё. Сям'я конюха Улейкі, якая выпрацавала 800 працадзён, а да канца года будзе мець 1.000 працадзён, атрымае больш 500 пудоў зярна, каля 1.500 пудоў бульбы, 2.000 рублёў грашыма, 60 пудоў гародніны і дастатковую колькасць кармоў для асабістай жывёлы. Такую-ж колькасць прадуктаў і грошай атрымае сям'я Сцяпана Лапаты.

Калгаснікі не супакойваюцца на дасягнутым. У будучым годзе яны мяркуюць атрымаць яшчэ большы ўраджай. Ужо зараз яны рыхтуюцца да вясны. Калгасны каваль К. Лазар рамантуе інвентар. Калгас мае невялікую свінаферму. У будучым годзе калгаснікі мяркуюць зрабіць свінаферму самай буйнай у раёне і самай даходнай крыніцай гаспадаркі.

У калгасе ёсць два з паловай гектары саду, будзе пасаджана яшчэ два гектары.

Змянілася жыццё былых батракоў. Яны разагнулі свае спіны і цвёрдай, упэўненай хадою ідуць па новаму, калгаснаму шляху.

Г. Лупсякоў.
М. Дубаў.



Стаханаўцы 2-га тэкстыльнага камбіната. Сядзіць (злева) тав. Вільчэўскі А. А. Стаяць (злева) тт. Нішт Г. А., Левін, С. А., Шэйнога В. І. і Стаселюк Ч. В.

Фота А. Сапіра.

ДРУЖБА

...Глуха гудзяць машыны. Рытмічна працуюць станкі, а над імі, ахопленыя адной думкай, нахіляюцца ткачы Вільчэўскія, Левіны, Шэйногі, Зільберштэйны — палякі, беларусы, яўрэі. А гэта думка — іх агульная справа, будаўніцтва новага жыцця. Няма ўжо ні хрысціянскіх, ні яўрэйскіх станкоў. Яны агульныя, народныя.

Ткач Гершковіч скончыў сваю змену. Старанна, дасканала аглядзеў ён свой станок. Ачысціў, змазаў колы, праверыў, чаўнакі і патанялкі. Трэба перадаць яму станок у поўным парадку. З Стаселюком у іх стварылася моцная дружба. Раней яны таксама ведалі адзін другога, але неяк здалёку. Цяпер, калі сустракаюцца на вуліцы, гутараць доўгадоўга і запрашаюць адзін другога да сябе дамоў. Калі Гершковіч першым на камбінаце перайшоў на абслугоўванне двух станкоў, Стаселюк адразу-ж паследваў яго прыкладу.

Зільберштэйн, вопытны рабочы, некалькі месяцаў працаваў з маладзейшым за яго Вацлавам Шэйногай. Працавалі на адных станках: адзін з раніцы, другі — пасля абеда.

— Гэта мой выхаванец, — гаворыць Зільберштэйн з гордасцю пра Шэйногу. — Ён расце палітычна з кожным днём, а як ткач — ён адзін з першых на камбінаце.

Пасля Шэйногу перавялі ў другі ткацкі аддзел — да маладых стаханаўцаў. Але і тут яго партнёрам з'яўляецца ткач-яўрэй Ехіель Зарэмбскі. Як цёпла аб ім расказвае Шэйнога!

— Малады, — гаворыць ён, — але які спрытны! Работа ідзе ў яго як па маслу. Мы спаборнічаем. Калі я дасягаю 70 тысяч удараў пры норме 69 тысяч, то ён не вельмі адстае ад мяне.

Новы дух запанаваў у фабрычных залах. Пролетарскі інтэрнацыяналізм, праследуемы ў часы панавання эксплаататараў, становіцца ўсё больш магутным, глыбокім, ахапляе ўсё больш шырокія кругі рабочых. А было калісьці інакш.

Вільчэўскі памятае... Кроў сцякала марудна. Кроплі яе спадалі на размокшую зямлю, змешваліся з чорным восеньскім балотам. Шырокую мазолістую далонь ён прыціскаў да параненага твара і глядзеў, як аслупянелы. У першую мінуту ён нічога не зразумеў. Што-ж ён, уласна кажучы, зрабіў гэтаму Скаўронскаму?

Ён-жа толькі спакойна, цярпліва растлумачваў яму, што гэтыя напады на яўрэйскую бедноту, на гэтых замучаных шаўцоў і краўцоў, біццё шыб у малых хатках на Рыбным базары лье толькі ваду на млын фабрыканта, што рабочы рабочаму павінен быць братам, які-б ні быў колер яго твару.

Але Скаўронскі глядзеў на яго з іранічна-скрыўленымі вуснамі. У вачах яго запаліліся злыя агеньчыкі. І раптам ён вырваў заціснуты кулак з кішэні і ўдарыў яго з усёй сілы нейкай цяжкай, цвёрдай рэччу.

Вострая боль пранізала твар і вусны Вільчэўскага. У роце адчуў салоны смак крыві.

Затым пайшоў з фабрыкі. Усё ў ім дрыжала. У галаве паўтаралася адно і тое-ж пытанне: чаму?

Былі рабочыя пастаянныя і зменныя, яўрэі і хрысціяне. І былі людзі, якія тым толькі і жылі, што нацкоўвалі адных рабочых на другіх. Нават станкі былі розныя. Ксяндзы з хрысціянскай дэмакратыі, паны з ППС заклікалі да барацьбы за польскія станкі, а іх прыяцелі з бунда — за яўрэйскія. Цяпер стала інакш. І тыя, хто думаў па-старому, пачынаюць падпадаць новаму магутнаму ўплыву. Ткач Берыла працаваў радам з ткачом Дворкесам. Але яны амаль ніколі не гаварылі паміж сабой. Зараз-жа гэта добрыя суседзі.

Ужо ніякіх нацыянальных абмежаванняў, і гэта аблегчыла Левітану збліжэнне з польскімі і беларускімі рабочымі.

Дружба працоўных усіх нацыянальнасцей мацнее з кожным днём.

С. Натансон.



«Таварышы! Рабочая і сялянская рэволюцыя, аб неабходнасці якой увесь час гаварылі большэвікі, адбылася». (З выступлення В. І. Леніна на другім Усерасійскім з'ездзе Советаў 7-га лістапада (25 кастрычніка) 1917 года. Рэпрадукцыя. (Фотахроніка БЕЛТА).

XXIII гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі

У XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі з пачуццём законнай гордасці за сваю радзіму совецкі народ падводзіць вынікі слаўнага пройдзенага шляху.

Мінуўшы год для совецкага народа быў годам новых гістарычных перамог. Працоўным краін капіталізма ён прынёс новыя няшчасці і разарэнні.

23-ці год Вялікага Кастрычніка ў гісторыі соцыялістычнай рэволюцыі адзначан падзеямі велізарнага значэння. За гэты год доблесная Чырвоная Армія, разграміўшы фінскую белагвардзейшчыну, ліквідавала небяспечнейшы ачаг вайны, які імперыялістычныя драпежнікі стварылі на поўначы Еўропы для нападу на Совецкі Саюз. Пад сцяг соцыялізма сталі народы Прыбалтыкі, якія скінулі ярмо ненавіснай плутакратычнай клікі і ўступілі ў сям'ю совецкіх народаў. Вызвалены ад доўгагадовага гнёту румынскіх акупантаў народы Бесарабіі і Паўночнай часткі Букавіны. Зноў як і ў мінулым годзе, калі Чырвоная Армія з чэсцю выканала свой доўг, вызваліўшы з панскай кабалы народы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, капіталістычнаму свету прышлося пацясніцца. 23 мільёны людзей вырваны з капіталістычнага рабства. На землях, якія імперыялістычныя падпальшчыкі вайны яшчэ год назад разглядалі як плацдарм для нападу на СССР,—на Карэльскім перашыйку, на ўзбярэжжы Балтыкі, над урадлівымі далінамі шматпакутнай Бесарабіі — рэе цяпер чырвоны сцяг Советаў.

Народ сканцэнтраваў усю сваю ўвагу на рашэнні задач, якія стаяць зараз перад краінай ва ўмовах разгараючайся імперыялістычнай вайны. Галоўныя з гэтых задач — далейшае павышэнне прадукцыйнасці працы, умацаванне соцыялістычнай дысцыпліны, павелічэнне выпуску усіх відаў прадукцыі нашай прамысловасці. У гэтым — верны залог таго, што наша краіна будзе і ў далейшым мацаваць сваю абаронную магутнасць такімі тэмпамі, якіх патрабуе сучасная міжнародная абстаноўка, «каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку». (Сталін).

Совецкі народ з аднадушным адабрэннем сустрэў Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб пераходзе на 8-гадзінны рабочы дзень і 7-дзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў, аб павышэнні адказнасці за якасць прадукцыі, аб стварэнні дзяржаўных працоўных рэзерваў.

Ужо першыя месяцы барацьбы за ажыццяўленне гэтых Указаў далі адчувальныя рэзультаты. Умацоўваецца дысцыпліна працы, з дня ў дзень расце выпуск прадукцыі. Паспяхова выконвае план вугальная прамысловасць. Сур'ёзных поспехаў дабіліся металургі. За дзве дэкады кастрычніка ў параўнанні з тым-жа перыядам верасня выплаўка чыгуну ўзрасла яшчэ на 2,2 проц., выплаўка сталі — на 5,3 проц., выпуск гатовага пракату — на 6,3 проц. Падведзеныя нядаўна вынікі ўсесаюзнага спаборніцтва металургаў у трэцім квартале наглядна паказалі, што перамаглі ў спаборніцтве тыя прадпрыемствы, якія энергічна ўзяліся за ўмацаванне працоўнай і тэхналагічнай дысцыпліны, навялі большэвіцкі парадак на вытворчасці. Іменна гэтаму вучыць вопыт перадавікоў спаборніцтва — Кузнецкага металургічнага завода імені Сталіна, заводаў «Серп и молот» і «Электросталь». Буршчык Крыварожскай шахты Аляксей Семівалос, прыстасаваўшы новы метад многазабойнай, скораснай здабычы руды, дабіўся выканання 10—12 норм за змену. Лік паслядоўнікаў Семівалоса расце з кожным днём, і ў выніку здабыча руды ў Крыварожжы няўхільна і бурна ідзе ўгору. Навалаадбойшчык адной з данецкіх шахт Нікалай Краўцоў высунуў новы, скорасны метад ачысткі забоя ад падрубленага вугалю і паставіў небывалы рэкорд — выканаў норму на 855 процантаў. Шырокае прымяненне знайшоў на чыгуначным транспарце вопыт машыніста Яраслаўскай чыгункі Папавіна. Развіваецца і шырыцца ўсенародны стаханаўскі рух. Усе гэтыя факты невычарпальнай народнай ініцыятывы знамянуюць новыя і новыя поспехі нашай краіны ў ажыццяўленні паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма.

Выдатныя поспехі прынёс мінулы год і соцыялістычнай сельскай гаспадарцы. Расце ўраджайнасць калгасных і соўгасных палёў, павышаецца прадуктыўнасць жывёлагадоўлі. Буйнейшымі вехамі ў развіцці соцыялістычнай сельскай гаспадаркі з'явіліся пастановы ЦК ВКП(б) і Соўнаркома СССР аб змяненнях у палітыцы загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў, аб уборцы і загатоўках. Гэтыя пастановы, прасякнутыя сталінскімі клопатамі аб развіцці і росквіце калгаснага ладу, ужо далі свае першыя рэзультаты. Больш багатымі і рознабаковымі становяцца гаспадаркі калгасаў, растуць іх даходы, усё больш і больш прадукцыі здаюць яны соцыялістычнай дзяржаве.

Новыя перамогі прынёс мінулы год і ў галіне культуры. Усё больш ярка і выразна выступае перад усім светам роля нашай радзімы як сапраўднага і адзінага сцяганосца прагрэса. Выдатных поспехаў дасягнула перадавая совецкая навука— аб гэтым наглядна сведчыць велізарная колькасць каштоўнейшых навуковых работ, прадстаўленых на заслужэнне сталінскай прэміі. Квітнее мастацтва народаў СССР, нацыянальнае па форме, соцыялістычнае па зместу.

XXIII гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі разам з усім совецкім народам святкуюць вызваленыя народы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, Бесарабіі, Паўночнай Букавіны і Прыбалтыкі. Пад жыватворчым сонцам Сталінскай Канстытуцыі набылі яны новае, шчаслівае жыццё, пазналі радасць свабоднай працы. Адрадзілася прамысловасць, якую панаванне плутакратычных клік давяло да развалу, запрацавалі станкі, доўгія годы пакінутыя на бяздзеянне. У Барыславе — цэнтры нафтавай прамысловасці Заходняй Украіны — пушчана 790 бяздзейнічаўшых нафтавых вышак. Каля 40 тысяч беспрацоўных Літвы знайшлі прымяненне сваім ведам і працы. Ліквідавана ў асноўным беспрацоўе ў Эстоніі. Тысячы працоўных, якія годамі не мелі ніякіх сродкаў да існавання, уліліся ў растучую соцыялістычную прамысловасць Латвіі. На заводах і фабрыках Прыбалтыкі ўсё шырэй разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва, растуць рады ўдарнікаў, якія паказваюць узоры высокапрадукцыйнай працы. Звыш 400 тысяч беззямельных і малазямельных сялян Заходняй Украіны атрымалі больш мільёна гектараў зямлі, якая належала памешчыкам, кулакам і манастырам. 440 тысяч гектараў атрымалі сяляне Заходняй Беларусі. У Бесарабіі надзелена зямлёй каля 65 тысяч сялян. Заканчваецца зямельная рэформа ў Прыбалтыцы — і там зямля перайшла ў рукі сваіх сапраўдных гаспадароў.

Совецкі народ ведае, што залогам яго мірнай працы з'яўляецца несакрушальная баявая магутнасць яго ўзброеных сіл — Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Аб далейшым павышэнні іх боездольнасці клапоцяцца ўсе працоўныя нашай краіны — совецкія патрыёты. Выконваючы волю народа, ажыццяўляючы сталінскія ўказанні, байцы і камандзіры Чырвонай Арміі напружана працуюць над сваім баявым удасканаленнем — на палях вучэнняў, у абстаноўцы, максімальна набліжанай да баявой, каб па першаму загаду ўрада знішчыць любога ворага нашай радзімы, які пасмее пагражаць безапаснасці яе граніц.

Кастрычніцкія святкаванні ў гарадах і сёлах совецкай краіны зноў і зноў дэманструюць усяму свету што армія і народ у СССР — адзінае і неразрыўнае цэлае, таксама як будуць арганічна адзінымі фронт і тыл, калі падпальшчыкі вайны рызыкнуць выпрабаваць сілу совецкай зброі.

Ад Балтыкі да Ціхага акіяна, ад палярных мораў да блакітнага Дуная рэе вялікі, непераможны сцяг Леніна — Сталіна. Пад гэтым сцягам рабочыя і сяляне 23 годы назад ішлі на штурм капіталізма. Пад гэтым сцягам яны разграмілі полчышчы інтэрвентаў і белагвардзейцаў у грамадзянскай вайне і дабіліся рашаючых перамог у соцыялістычным будаўніцтве.

У дзень вялікага ўсенароднага свята думкі і пачуцці 193-мільённага совецкага народа звернуты да таго, чыё мудрае кіраўніцтва забяспечыла ўсе гэтыя сусветна-гістарычныя перамогі, чыё імя стала сімвалам несакрушальнай волі нашага народа да таржаства комунізма. І ад края да края неабсяжнай краіны нясуцца словы, што ідуць ад глыбіні сэрцаў, поўных сыноўняй любві, павагі і адданасці:

— Няхай жыве наш Сталін!

Н. Алексееў.

Стаханаўцам прамысловасці, транспарта, гандлю і сельскай гаспадаркі, знатным людзям нашай краіны—большэвіцкае прывітанне!

(З лозунгаў ЦК ВКП(б) да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі).



У інтэрнаце ўдзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве. На здымку: палітрук інтэрната тав. В. Я. Ястрабцаў гутарыць з экскурсантамі Беластоцкай вобласці аб рабоце выстаўкі.

Фота А. Сапіра.

ЖЫЦЦЁ АДНОЙ СЯМ'І

— У бацькі нас было шасцёра братоў. Хлеба свайго хапала толькі да каляд. А затым мы разам з бацькамі ішлі на падзёншчыну да памешчыка. І так кожны год. Дзяцінства маё прайшло ў нястачы і цяжкай працы,—расказвае аб сваім мінулым жыцці калгаснік сельскагаспадарчай арцелі імені Сталіна Аляксандр Гурскі.

Яму было толькі 8 год, калі ён пачаў дапамагаць бацьку ў гаспадарцы і на рабоце ў панскім маёнтку. Калі-ж Аляксандр і астатнія браты падраслі, пачаўся раздзел. Тры гектары зямлі трэба было раздзяліць на шэсць частак. У сям'і пачаліся сваркі. З-за кавалачка зямлі родныя браты сталі ворагамі.

І вось Аляксандр рашыў шукаць шчасця. Ён заявіў, што ад свайго права на зямлю адмаўляецца. Пачаліся мытарствы. Пошукі лепшага жыцця кідалі яго з аднаго горада ў другі. І ўсюды, дзе-б ён ні паяўляўся, яго сустракала нястача і цяжкая праца. Нарэшце, Аляксандр ні з чым вярнуўся ў сваё роднае сяло Бзуры. Але і дома было не лепш. Цяпер ён ужо быў пастаянным плотнікам у памешчыка Казлоўскага.

Аб жаніцьбе і думаць яму не прыходзілася. Хто за яго пойдзе! Прайшло 10 год работы ў паноў. Днямі недаядаючы, плотнік Гурскі зарабіў крыху грошай і купіў сабе чвэрць гектара зямлі, а потым пачаў будаваць хату. Зімой ён будаваў хату, а летам ішоў на заработкі. Будаўніцтва працягвалася многа год. Нарэшце, Аляксандр стаў гаспадаром, а яшчэ праз тры годы ажаніўся.

Першая імперыялістычная вайна застала Аляксандра Гурскага ў Сібіры. Калі ён прыехаў у сваё сяло, усё ішло па-старому, у хаце не было ні куска хлеба. Падрасталі дзеці, але вучыць іх у школе не прыйшлося. Трэба было дапамагаць бацьку зарабляць хлеб.

Павольна ішлі доўгія пакутныя годы...

У верасні 1939 года Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія прынесла працоўным вызваленне. Пры раздзеле памешчыцкай зямлі Аляксандр Гурскі атрымаў 5 гектараў. Пачалося новае жыццё.

Сяляне-беднякі і батракі ўважліва прыслухоўваліся да расказаў аб калгасах, аб жыцці калгаснікаў. Без хістанняў Аляксандр Гурскі разам з другімі батракамі і малазямельнымі сялянамі арганізавалі калгас імені Сталіна. Калектыўная праца ўсё больш заахвочвала маладых калгаснікаў. Яны стараліся, каб іх гаспадарка была ўзорнай, перадавой. Па вечарах у канцылярыі праўлення калгаса збіраліся калгаснікі і абмяркоўвалі гаспадарчыя пытанні, перспектывы развіцця свайго калгаса.

Прайшоў першы год калгаснага жыцця. Перад сям'ёй Аляксандра Гурскага адкрыліся новыя шляхі. Чэсная калектыўная праца забяспечыла іх хлебам, грашыма. Для дзяцей адчынены дзверы ў школу. Сын Гурскага Іосіф нядаўна скончыў курсы рахункаводаў. Зараз ён працуе ў сваім калгасе. Дачка рыхтуецца паступіць у педагагічнае вучылішча.

... На калгасным таку вялікае ажыўленне: стаіць многа фурманак. Старшыня калгаса Антон Віленскі заяўляе:

— Абавязацельствы перад дзяржавай выкананы. Цяпер выдаем авансы на працадні.

Да вагаўшчыка першым падыйшоў Аляксандр Гурскі. Яму падалі ведамасць. За 9 месяцаў яго сям'я выпрацавала 650 працадзён. Трэба атрымаць авансам паўтары тоны жыта і поўтоны пшаніцы. Распісваючыся ў ведамасці, Аляксандр прагаварыў:

— Столькі хлеба я ніколі не меў. Куды я буду яго дзяваць? Пры канчатковым размеркаванні прыдзецца яшчэ больш атрымаць. Падлічана-ж, што на кожны працадзень прыпадае па 7 кілограмаў зярна і па 16 кілограмаў бульбы. На тры годы хопіць хлеба!

Так зараз жыве калгасная сям'я былога батрака.

В. Гарбанёў.

Жыву і радуюся

Сёння, у знамянальны дзень вялікага свята ўсіх працоўных, мне ўспамінаецца пройдзены мною шлях, шлях радавога рабочага-ліцейшчыка. Другі раз у сваім жыцці я адкрыта святкую Вялікую гадавіну. За сваё свядомае жыццё я многа чаго бачыў, многа перажыў. Бязрадаснымі былі першыя крокі маёй вытворчай дзейнасці, звычайныя для рабочага, які жадае набыць кваліфікацыю.

На Лапскім паравоза-вагонарамонтным заводзе працую ўжо 18 год. Тут, у гэтых корпусах, я на сваёй уласнай спіне адчуў увесь прыгнёт капіталістычнай эксплаатацыі. Кожны рабочы павінен быў час ад часу даваць хабар майстру. Апошні вельмі жорстка здзекваўся над рабочымі. Мяне лічылі з людзей непакорных.

— Ад мяне яны нічога не атрымаюць,—гаварыў я рабочым. І заўсёды прытрымліваўся свайго слова. За гэта майстры мяне ненавідзелі і стараліся выжыць з прадпрыемства.

Аднойчы мяне, ліцейшчыка, перавялі працаваць у вагонны цэх у якасці слесара. Усё гэта было разлічана для таго, каб я мала зарабляў. Так я цэлы год вымушан быў працаваць не па спецыяльнасці. Але я не сумаваў.

Поўнымі грудзьмі я ўпершыню ўздыхнуў, калі прыйшла наша родная Чырвоная Армія, прынёсшая пароду свабоду і шчасце. Канула ў вечнасць праклятае мінулае.

Пры совецкай уладзе мяне, радавога рабочага-ліцейшчыка, прыкмецілі. І, здаецца, я нічога асаблівага не зрабіў. Я толькі чэсна працую на дабро нашай радзімы. Стараюся працаваць так, каб паказаць прыклад і астатнім. У верасні я выканаў план на 254 процанты. І ў кастрычніку сваіх тэмпаў таксама не здаў. Брыгада, брыгадзірам якой я з'яўляюся, штомесячна перакрывае сваю вытворчую праграму. Менш 200 процантаў мы ніколі не даем. І таму з'яўляемся кандыдатамі на атрыманне пераходнага чырвонага сцяга.

Нядаўна мяне паўторна прэміравалі. А было гэта так. Сярод жалезнага лому валяліся і нягодныя паравыя цыліндры. Я адліў да іх новыя часці. Хоць гэта работа патрабавала вялікага напружання, але выканаў я яе акуратна. Шэсць нягодных паравых цыліндраў былі прыведзены ў спраўнасць. Ад гэтай работы завод атрымаў эканомію ў суме 14 тысяч рублёў.

Аб сабе магу сказаць наступнае: жыву добра, жыву і радуюся. Штомесячна зарабляю 1.000 — 1.200 рублёў.

Сёння, у дзень слаўнай гадавіны, хочацца ад душы падзякаваць наш урад, роднага таварыша Сталіна за радаснае шчаслівае жыццё.

А. Ф. Астроўскі,
брыгадзір-ліцейшчык Лапскага паравоза-вагонарамонтнага завода.

Буду працаваць яшчэ лепш

Да 7 лістапада—вялікага свята працоўных—усе мы рыхтаваліся з вялікім уздымам. І гэта зразумела. У дзень XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі кожны працоўны краіны соцыялізма падводзіць вынікі сваёй работы, намячае шляхі ў сваёй далейшай рабоце і дзейнасці.

Я працую ткачом на 25-й беластоцкай фабрыцы. Пасля ўстанаўлення совецкай улады я даведаўся, што ў Совецкім Саюзе ёсць стаханаўцы—людзі, паказваючыя высокія ўзоры ў рабоце. Я рашыў стаць стаханаўцам. Памятаю, як цяпер. Я з'явіўся да начальніка цэха і заявіў аб сваім намеры. Мне пайшлі насустрач. Выдзелілі для абслугоўвання два станкі. І адразу-ж у першыя дні работы на двух станках я дабіўся выдатных рэзультатаў.

Майму прыкладу пачалі следаваць і іншыя рабочыя нашай фабрыкі. Стаханаўскі рух на прадпрыемстве ўсё разрастаўся. І цяпер на нашым прадпрыемстве стаханаўцы налічваюцца ўжо не адзінкамі. У кожным цэху выраслі перадавыя людзі соцыялістычнай вытворчасці.

Я сістэматычна выконваю сваю норму выпрацоўкі на 120 процантаў. Стараюся не толькі добра працаваць, але і перадаю вопыт іншым рабочым. Працую інструктарам стаханаўскай школы, дзе перадаю свой вопыт работы. Некаторыя рабочыя-тэкстыльшчыкі з'яўляюцца маімі вучнямі, як, напрыклад, Каплан, Хароўскі.

Акрамя маёй асноўнай работы, я таксама выконваю і грамадскія даручэнні. Нядаўна мяне выбралі старшынёй акруговай камісіі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Адначасова з'яўляюся старшынёй цэхавага камітэта. Наш ткацкі цэх штодзённа перавыконвае сваё вытворчае заданне.

Думаю ў далейшым не спыніцца на дасягнутых поспехах, а яшчэ працаваць лепш, больш прадукцыйна.

І. Ф. Блат,
ткач-двухстаночнік 25-й тэкстыльнай фабрыкі.





Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва, ткач-двухстаночнік 13-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната М. Д. Ятвецкі выконвае норму на 120 процантаў. Матальшчыца гэтага-ж камбіната К. О. Шэйн перайшла на ўшчыльненую работу і працуе на 24 верацёнах.

Фота А. Сапіра.

НА ДАСЯГНУТЫМ НЕ СПЫНЯЮСЯ

Мне 18 год. Да прыходу Чырвонай Арміі я не працавала, была на ўтрыманні бацькоў. Пасля прыходу Чырвонай Арміі я з'явілася ў аддзел кадраў Лапскага паравоза-вагонарамонтнага завода.

— Токарам жадаю стаць,—сказала я,—кваліфікацыю жадаю атрымаць.

Мяне прынялі на работу. З вялікім жарам я прынялася асвайваць спецыяльнасць токара. Гэта было ў студзені 1940 года. Маладых дзяўчат, якія пажадалі стаць токарамі, было некалькі чалавек.

Пасля трох месяцаў работы на заводзе, мне далі трэці разрад. Мая радасць была бязмежная. Я стала працаваць самастойна. Поспехі ў рабоце раслі.

Цяпер, у знамянальную XXIII гадавіну Вялікага Кастрычніка я магу падвесці некаторыя вынікі. Самы радасны вынік—я прыйшла да гэтага знамянальнага дня членам ленінскага комсамола. З вялікім задавальненнем магу сказаць, што з'яўляюся стаханаўкай. Значна перавыконваю норму выпрацоўкі. Да 7 лістапада я абавязалася выконваць паўтары нормы. Сваё слова стрымала. Цяпер я сістэматычна выконваю сваё вытворчае заданне на 160 процантаў.

Мне ўспамінаецца цікавы момант. Калі паступіла на работу, знайшліся і такія, якія, пасмейваючыся, пагаварвалі: «З яе токар не выйдзе» Гэтыя малаверы аказаліся няправымі. Я стала токарам і, кажуць, нядрэнным. Вядома, мне яшчэ трэба многа працаваць, каб стаць высока кваліфікаваным працаўніком. Я не сумняваюся ў дасягненні гэтага.

Акрамя сваёй асноўнай работы, я выконваю і грамадскія даручэнні. Нядаўна мяне вылучылі членам участковай выбарчай камісіі.

На дасягнутых мною поспехах не спынюся, а буду яшчэ больш удасканальвацца. Для гэтага ў мяне ёсць усе магчымасці.

Ш. І. Гура,
токар-стаханаўка Лапскага паравоза-вагонарамонтнага завода.

Наватары-энтузіясты

Ткачу Сендэру Беркавічу Маламеду ўсяго толькі 26 год, але ён ужо атрымаў званне інструктара па стаханаўскай працы. Сем месяцаў назад ён прышоў да начальніка ткацкага цэха і заявіў, што будзе працаваць на чатырох станках таксама паспяхова, як і на двух. Працаваць на чатырох станках яшчэ ў студзені спрабаваў ткач Ліўшыц. Але ў яго не ладзілася. Сендэр, уважліва прасачыўшы за работай Ліўшыца, прышоў да вываду, што той няправільна арганізуе працу.

У першым-жа дні Маламед пачаў даваць 128 тысяч удараў, затым 130, 140 і нарэшце 150. На тых-жа станках, на якіх працаваў Ліўшыц, Маламед паказаў нябачаную прадукцыйнасць у тэкстыльнай прамысловасці Беластока. Кожны дзень ён адзін здаваў больш 100 метраў сукна першага сорту, гэта значыць столькі, колькі здавалі чатыры ткачы-аднастаночнікі.

Прыкладу Маламеда наследвалі і іншыя стаханаўцы. Моўша Лейбавіч Кабрынскі, Шлёма Альбертавіч Бахрах — вось людзі, паследаваўшыя прыкладу наватара вытворчасці Маламеда.

Аб тым, што пабудзіла стаханаўца Бахрах перайсці на чатыры станкі, ён расказвае так:


— Мне 34 годы. 25 год працую на вытворчасці. Але ткачом працую ўсяго чацверты год. Прызнацца, я спачатку не меў цвёрдай надзеі, што пры маёй кваліфікацыі змагу працаваць на чатырох станках. Але я рашыў узяцца за справу і паказаць прыклад астатнім.

І тав. Бахрах не памыліўся. Услед за ім перайшлі на чатыры станкі ткачы т.т. Цікоцкі і Кот. Яны падалі заявы аб тым, што жадаюць перайсці на ўшчыльненую працу. На камбінаце пачаўся масавы рух стаханаўцаў-чатырохстаночнікаў.

В. Арэф'еў.

Выстрал „Авроры“

«Крэйсер «Аврора» громам сваіх гармат, накірованых на Зімні палац, узвясціў 25 кастрычніка пачатак новай эры—эры Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі» («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)».



Крэйсер «Аврора».

Фота А. Міхайлава. Фота-клішэ ТАСС.

Быў 1916 год. Насоўваліся вялікія гістарычныя падзеі. На крэйсеры «Аврора», які стаяў на рамонце ў Петраградзе, згрупіравалася моцнае ядро рэволюцыйна настроеных матросаў. У дні звяржэння самаўладства на крэйсеры арганізаваўся суднавы камітэт. Аўрорцы паслалі сваіх дэпутатаў у Советы.

Керэнскі не раз прабаваў удаліць «Аврору» з Петраграда. Але крэйсер, якім завалодалі матросы, не выканаў ні аднаго загада Керэнскага і не зніmаўся з якара. Аўрорцы падпарадкоўваліся толькі Ваенна-рэволюцыйнаму камітэту.

І вось наступіў дзень, калі крэйсеру «Аврора» прышлося выканаць асоба адказнае і пачотнае заданне Ваенна-рэволюцыйнага камітэта.

Гэтым днём было 25 кастрычніка 1917 года.

* * *

24 кастрычніка. На цёмным асеннім небе паўзуць нізкія, сівыя воблакі. Туман апускаецца над горадам. Змрок. Павольна ўзнімаюцца ўгору гарбатыя аркі мастоў. Скрыпяць разводныя механізмы. Каля іх мітусяцца юнкеры. Яны стараюцца як мага хутчэй адрэзаць штаб рэволюцыі — Смольны ад чырвонагвардзейскіх атрадаў Васільеўскага вострава, Выбаргскай і Петраградскай старон.

Перабягаючы ад пад'езда к пад'езду, спяшаюцца да мастоў людзі з чырвонымі павязкамі на рукавах. На некалькі імгненняў разарвала напружаную цішыню кароткая кулямётная чарга. І зноў цішыня. Гаснуць агні ў дамах.

Замёр, насцярожыўся горад. На крэйсеры «Аврора» ўжо сыграна вячэрняя дудка, але маракі не спяць. У браніраванай рубцы на маленькім стале ляжаць загады Ваенна-рэволюцыйнага камітэта. Камісар «Авроры» Белышаў уважліва перачытвае іх. Вось прадпісанне № 1 «Камісару «Авроры». На бланку ваеннага аддзела Выканкома Петраградскага Совета напісана: «Петраградскаму Совету пагражае прамая небяспека: уночы контррэволюцыйныя заговоршчыкі прабавалі выклікаць з акаліц юнкераў і ўдарныя батальёны ў Петраград. Газеты «Солдат» і «Рабочий путь» закрыты. Прадпісваецца прывесці полк у баявую гатоўнасць. Чакайце далейшых распараджэнняў. Усякае прамаруджанне і замяшанне будзе разглядацца, як здрада рэволюцыі».

Другое прадпісанне:

«У выпадку нападу на Петраградскі гарнізон з боку контррэволюцыйных сіл крэйсеру «Аврора» належыць забяспечыць сябе буксірамі і паравым катэрам».

І, нарэшце, трэцяе, сакрэтнае:

«Камісару крэйсера «Аврора». Ваенна-рэволюцыйны камітэт пастанавіў: **Даручыць вам усімі маючыміся ў вашым распараджэнні сродкамі аднавіць рух на Нікалаеўскім масту».**

Значыць трэба неадкладна выступаць. Камісар перадае загад камандзіру крэйсера.

— Усе па месцах!—гучыць каманда. Глуха грымяць ланцугі якароў. Але гэты камандзір хітрыць:

— Гэта прадпісанне не можа быць выканана. «Аврора» не можа падыйсці да Нікалаеўскага маста... Магчыма пасадка на мель. Я не маю права рызыкаваць.

— Загад атрыман! Ён павінен быць выканан!—грыміць голас камісара.

Камандзір пакідае рубку. Ён адмаўляецца выканаць загад. Ну, што-ж! Камісар распараджаецца сам. Белышаў кліча старшыну—сігнальшчыка Захарава і іменем Ваенна-рэволюцыйнага камітэта загадвае яму зрабіць прамер глыбінь ракі па фарватэру да самага маста.

Праз некалькі мінут шлюпка варочаецца. Захараў дакладвае:

— Таварыш камісар, глыбіня падыходзячая. Смела можам ісці.

Здрыгаючыся ўсім корпусам, крэйсер разварачваецца на Няве і рушыць да маста.

— Мост на насу! — даносіць сігнальшчык. Крэйсер спыніўся. Грозныя дулы гармат накіраваны прамой наводкай на мост. Камісар, узяўшы ў рукі мегафон, крычыць збянтэжаным юнкерам:

— Неадкладна выбірайцеся, або я адкрыю агонь!

У сляпячым промені пражэктара «Авроры» відаць, як хутка пусцее мост. «Доблесныя» абаронцы Керэнскага, не зрабіўшы ні аднаго выстралу, уцякаюць па набярэжнай, высока задраўшы полы шыняляў.

Праз некалькі мінут аўрорцы прыступаюць да наводкі маста.

* * *

Усю ноч і раніцу 25 кастрычніка на крэйсеры «Аврора» рыхтаваліся да абстрэлу Зімняга палаца. У інструкцыі, атрыманай ад Ваенна-рэволюцыйнага камітэта, гаварылася:

«Пасля сігнальных гарматных выстралаў з Петрапаўлаўскай крэпасці зрабіць некалькі халастых выстралаў па палацу і, гледзячы па акалічнасці, калі спатрэбіцца, адкрыць баявы агонь».

Павольна паўзуць стрэлкі гадзінніка. Сігнала з Петрапаўлаўкі ўсё няма і няма. Кожныя поўгадзіны камісар пасылае ў Смольны веставых. Яны варочаюцца з хвалюючымі весткамі: рэволюцыйнымі атрадамі заняты цэнтральны тэлеграф, тэлефонная станцыя, вакзалы, пошта, банкі. Не занята да гэтага часу толькі апошняя цытадэль старога свету — Зімні палац.

Чорнымі вачаніцамі вокан панура глядзіць у Няву Зімні палац. Толькі ў двух вокнах трэцяга паверха гарыць святло. Там міністры апошняга ўрада буржуазіі праводзяць сваё апошняе пасяджэнне... Высокія барыкады з штабеляў дроў шчыльным колам апяразваюць Зімні палац. Паміж паленняў выглядваюць чорныя дулы вінтовак і кулямётаў.

У кубрык «Авроры» уваходзіць камісар. Усхвалёвана чытае ён тэкст ленінскай тэлеграмы, толькі што перададзенай радыёстанцыяй «Авроры»:

«Часовы ўрад нізложан...

Справа, за якую змагаўся народ: неадкладная прапанова дэмакратычнага міру, адмена памешчыцкай уласнасці на зямлю, рабочы кантроль над вытворчасцю, стварэнне совецкага ўрада, гэта справа забяспечана».

Незабываемыя, хвалюючыя мінуты! Перамога народа забяспечана!

Загрукалі гарматы Петрапаўлаўскай крэпасці. «Аврора» пачула сігнал.

— Гарматныя разлікі, па месцах!—грыміць каманда камісара.

—З насавой гарматы... Прамой наводкай... Па Зімняму палацу... Агонь!

Выстрал з крэйсера «Аврора» быў сігналам да рашаючага штурму. Адразу-ж застракаталі кулямёты, зашчоўкалі вінтоўкі. Здрыгаючы брук, загулі браневікі. Пад перакрыжавальным кулямётным і ружэйным агнём лавіна чырвонагвардзейцаў уварвалася ў палац. Апракідваючы юнкераў, доблесныя воіны рэволюцыі крочылі па мармурных лесвіцах, па мяккіх каўрах, па гулкіх пустынных залах і карыдорах.

Другі, трэці паверх...

— Вось ён, часовы... Далоў!!!...

... На месца старшыні II з'езда Советаў падымаецца Якаў Міхайлавіч Свердлаў.

У зале з'езда паяўляецца матрос «Авроры». Бурнай авацыяй сустракаюць дэлегаты з'езда яго паведамленне аб тым, што Зімні палац узят.

* * *

Выстрал «Авроры» прагучэў на ўвесь свет. З таго часу слова «Аврора» неадлучна ў сазнанні народаў ад Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Д. Леванеўскі.
Е. Сабалеўскі.

Рост эканомікі і культуры вобласці
(Лічбы і факты)

У 1940 годзе народная гаспадарка Беластоцкай вобласці дасягнула велізарнага росту і развіцця. Рэканструіравана і сканцэнтрыравана тэкстыльная прамысловасць. З 133 дробных тэкстыльных прадпрыемстваў, дзе працавала 4.792 рабочых, створана 29 буйных камбінатаў і фабрык, дзе працуе 10.954 рабочых.

За 10 месяцаў 1940 года Беласток даў краіне 10.140.000 метраў сукна.

Тры абутковыя фабрыкі выпусцілі з пачатку года 72.000 пар скуранога абутку. 150.000 пар гатовага абутку вырабілі шавецкія майстэрні.

Заводы будаўнічых матэрыялаў вырабілі каля 23 мільёнаў штук цэглы, больш 400.000 штук чарапіцы, 83,191 тону цэменту, 94.075 тон клінкеру.

Лесаапрацоўчыя заводы далі звыш 134 тысяч кубаметраў піламатэрыялаў, звыш 22 тысяч тон фанеры.

Аднаўлены табачная фабрыка ў Беластоку, чыгуналіцейны завод, будуецца фабрыка фетравых вырабаў.

На капітальнае будаўніцтва на 1940 год па Беластоцкай вобласці дзяржавай адпушчана 36 мільёнаў рублёў.

Савецкая ўлада раздала малазямельным і беззямельным сялянам і калгасам 86.420 гектараў памешчыцкіх і асадніцкіх зямель.

У вобласці арганізавана 164 калгасы, у якія добраахвотна ўступіла звыш 7 тысяч гаспадарак.

Створаны 9 соўгасаў, якія маюць 25 трактараў. У раёнах арганізавана 24 машынна-трактарных станцыі з паркам у 214 трактараў.

На народную асвету па Беластоцкай вобласці на 1940 год дзяржавай адпушчана 63.688.200 рублёў. У пачатковых, няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах бясплатна вучацца 201.994 вучні. У гарадах і раённых цэнтрах арганізавана 56 дзіцячых садоў на 3.400 дзяцей. У 18 дзетдамах выхоўваецца 1.295 беспрытульных.

У вобласці створаны 24 дамы сацыялістычнай культуры, 226 хат-чытальнь, абласная бібліятэка, 23 раённых, 9 гарадскіх, 74 сельскіх і 3 дзіцячых бібліятэкі. Тры музеі вядуць цікавую гістарычна-краязнаўчую работу.

Савецкая ўлада арганізавала для ўсіх працоўных бясплатную медыцынскую дапамогу. У гарадах і гарадскіх пасёлках працуе 46 амбулаторый і паліклінік, разгорнута каля 2.800 бальнічных ложкаў. У самых аддалёных паселішчах арганізаваны 22 фельчарскіх і 50 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Арганізавана 7 туберкулёзных дыспансераў і пунктаў, адна туберкулёзная бальніца, адкрыта 9 скурна-венерычных дыспансераў і пунктаў.

У кожным горадзе і раённым цэнтры круглыя суткі працуе хуткая медыцынская дапамога. У Беластоку арганізавана хуткая дапамога санітарнай авіяцыі, якая абслугоўвае ўсю вобласць.

На курорце ў Друскеніках у гэтым годзе лячылася і адпачывала каля 5 тысяч працоўных.

Усяго на ахову здароўя па Беластоцкай вобласці дзяржавай на 1940 год асігнавана 28 мільёнаў рублёў,—20 працэнтаў усяго бюджэта вобласці.

—о—

У САВЕЦКІ САЮЗ ПРЫБЫЎ ТАВ. РАКОШЫ

Вядомы дзеяч венгерскага рабочага руху тав. Мацяс Ракошы, які знаходзіўся ў зняволенні 15 год, у выніку перагавораў паміж урадам СССР і венгерскім урадам вызвален з турмы і прыбыў у Савецкі Саюз.

3-га лістапада тав. Ракошы быў горача сустрэт прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый г. Львова. Пасля кароткага адпачынку тав. Ракошы выехаў адсюль у Кіеў. Да прыходу поезда на вакзале ў Кіеве сабраліся прадстаўнікі партыйных і савецкіх арганізацый, якія з вялікай цеплынёй віталі тав. Ракошы.

6-га лістапада тав. Ракошы прыбыў ў Маскву. Сумесна з ім прыязджае тав. Золтан Вайнбергер, вызвалены з венгерскай турмы пасля адбыцця 15-гадовага зняволення.

(ТАСС).

УЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ КРАІНЫ САЦЫЯЛІЗМА

Адразу-ж пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі працоўныя масы пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна ўзяліся за стварэнне сваіх узброеных сіл. У найцяжэйшых умовах разрухі і голаду, у працэсе гіганцкай барацьбы супроць белагвардзейцаў і інтэрвентаў стваралася Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія. Не гледзячы на тое, што Чырвоная Армія спачатку не мела ў сваім распараджэнні неабходных узброеных і кваліфікаваных камандных кадраў з рабочых і сялян, яна ўжо ў першыя годы свайго існавання і барацьбы наглядна паказала ўсяму свету сваю сілу і магутнасць.

«Партыя гардзіцца,—гаварыў таварыш Сталін,—што ёй удалося стварыць з дапамогаю рабочых і сялян першую ў свеце Чырвоную Армію, у найвялікшых бітвах адстайваўшую і адстаяўшую свабоду рабочых і сялян.

Партыя гардзіцца, што Чырвонай Арміі ўдалося з чэсцю прайсці цяжкі шлях лютых баёў з унутранымі і знешнімі ворагамі рабочага класа і сялянства нашай краіны, што ёй удалося аформіцца ў найвялікшую баявую рэвалюцыйную сілу на страх ворагам рабочага класа, на радасць усім прыгнечаным і заняволеным». (І. Сталін, «Аб трох асаблівасцях Чырвонай Арміі», стар. 3).

Поўны разгром шматлікіх армій інтэрвентаў і белагвардзейцаў, узброеных першакласнай тэхнікай, кіруемых царскімі генераламі, паказаў усяму свету, што вызвалены працоўны народ, як гэта прадбачыў Фрыдрых Энгельс, можа стварыць сваё ваеннае майстэрства. Выдатным падцвярджэннем таму, што савецкі народ не толькі стварыў сваё ваеннае майстэрства, але і авалодаў ім, служаць бліскучыя ваенныя аперацыі Чырвонай Арміі супроць Калчака, Юдзеніча, Дзенікіна, Врангеля, белапалякаў. Аперацыі, праведзеныя пад непасрэдным, асабістым кіраўніцтвам вялікага стратэга пралетарскай рэвалюцыі таварыша Сталіна, прадстаўляюць сабой неперавзыйдзеныя ўзоры марксісцкай рэвалюцыйнай стратэгіі, каштоўнейшы ўклад у скарбніцу ваеннай тэорыі і гісторыі.

Крыніца сілы і магутнасці Чырвонай Арміі заключаецца ў тым, што яна ёсць сапраўды народная армія, армія братства паміж народамі нашай краіны, паміж працоўнымі народамі ўсяго свету. Яна не ставіць перад сабой захватніцкіх задач; яна стаіць на варце граніц СССР—вялікай бацькаўшчыны працоўных усяго свету—і заўсёды гатова адстаяць гэту бацькаўшчыну ад любога нападу звонку.

І кожны раз, калі ля граніц нашай краіны пачыналі сваю крывавую дзейнасць падпальшчыкі вайны, новы парыў баявога энтузіязма ахапляў увесь савецкі народ. Сотні тысяч заяў савецкіх патрыётаў з просьбай паслаць іх на фронт у раён баявых дзеянняў атрымоўвалі ваенныя органы ў дні хасанскіх баёў, вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь, у месяцы вайны супроць белафінаў.

Чырвоная Армія расла і мацнела разам з усёй краінай. Цяпер Чырвоная Армія распалагае навейшай баявой тэхнікай, абучанымі кадрамі, якія ў дасканаласці валодаюць гэтай тэхнікай, і праверанымі ў баях камандным і палітычным саставам.

У апошні час Чырвоная Армія прайшла тры баявых праверкі: на Халхін-Голе, у Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі і, нарэшце, самую складаную і цяжкую—у Фінляндыі. Усе гэтыя праверкі Чырвоная Армія вытрымала з чэсцю. На сваіх спінах адчулі ворагі велізарную наступальную сілу чырвоных дывізій, магутнасць нашай ваеннай тэхнікі, неперавзыйдзеную храбрасць, гераізм воінаў краіны сацыялізма. У баях за радзіму, за справу Леніна—Сталіна чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі праявілі нябачаны ў гісторыі масавы гераізм, Чырвонай Арміі па самой яе прыродзе. У суровых зімовых умовах баёў у Фінляндыі часці Чырвонай Арміі паказалі, на якія паісціне цуды здольна армія савецкага народа. Яна не аставіла камня на камні ад умацаванняў працўніка, якія буржуазныя знатакі ваеннай справы лічылі непрыступнымі.

Дзесяткі тысяч ордэнаносцаў мае ў сваіх радах наша доблесная Чырвоная Армія. З кожным боем, з кожнай перамогай папаўнялася і будзе папаўняцца слаўная сям'я ўсенародных любімцаў—Герояў Савецкага Саюза. Імёны Краўчанкі, Угрумава, Дзянісава, Трусава, Ульянава, Пулькіна, Лапцева, Камарова і многіх іншых шырока вядомы ўсяму нашаму народу. Многія імёны адважных сыноў Чырвонай Арміі ведае ўвесь свет.

Дзякуючы мудрай сталінскай знешняй палітыцы, якая апіраецца на несакрушымую магутнасць Чырвонай Арміі і эканамічную магутнасць усёй краіны, Савецкі Саюз знаходзіцца зне поля вайны.

«Наш народ любіць мір, цэніць яго вялікае дабро і змагаецца за мір ва ўсім свеце. Але ён умее і ваяваць. І не толькі ўмее, але і любіць ваяваць». (Варашылаў). Наш народ ні на мінуту не забывае аб капіталістычным акружэнні, свята памятае ўказанне вялікага Сталіна і заўсёды, з дня ў дзень, павышае сваю мабілізацыйную гатоўнасць, каб ніякія «фокусы» знешніх ворагаў не засталі яго знянацку.

Савецкі народ цвёрда і ўпэўнена ідзе ўперад па шляху да камунізма. На варце яго свабоднай сацыялістычнай працы, на варце вялікіх заваёў Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі стаіць Чырвоная Армія, несакрушымая ўзброеная сіла сацыялізма, створаная Леніным і Сталіным.

Я. Абрамаў.



Група выхаванцаў беластоцкага дзіцячага дома № 2.

Фота А. Сапіра.

Знойдзенае жыццё

Рознымі шляхамі яны трапілі ў дзіцячы дом. Многія з іх нават не мелі прозвішчаў: маленькіх, іх падабралі пад парогам цаглянага дома. Іх падкінулі маці, страціўшыя надзею пракарміць сябе і сваё дзіцё. Некаторыя прайшлі суровую школу вуліцы: годы беспрытульнага валацужніцтва, папрашайніцтва, дробнага крадзяжу. Ёсць і такія, што страцілі бацькоў нядаўна, у час польска-германскай вайны і пешшу ішлі з Варшавы, Лодзі і іншых гарадоў на бляск чырвонаармейскай зоркі. Іх прытуліла вялікая радзіма, дзе няма сірот і беспрытульных, дзе сонца свеціць аднолькава для ўсіх дзяцей.

...Дзіцячы дом № 2 па Рэвалюцыйнай вуліцы. Тут пачынаецца жыццё для многіх дзяцей, выкінутых за борт праклятым капіталістычным ладам. Дырэктар Дора Маркаўна Грузінская, выхавацелі-педагогі Л. І. Блютрайх, С. А. Райхінталь, Р. Бліндус і іншыя, якім партыяй і савецкай уладай даручана адказная і пачотная задача, падобна скульптарам, вылепліваць чалавечыя душы, настаўляць іх на жыццёвую дарогу, —прыкладаюць усе свае сілы і ўменне, каб акружыць дзяцей мацярынскімі клопатамі, забяспечыць ім шчаслівае дзяцінства.

Вось чарнявая дзяўчынка Дэбора Ліс. Яна жыла ў Варшаве. У час бамбардыроўкі яна страціла бацькоў і разам з сотнямі бежанцаў накіравалася на ўсход.

— Хадзілі чуткі, — гаворыць яна, — што ў Беластоку Советы. Я і пайшла сюды.

Дэбора Ліс — выдатніца 6-га класа 8-ай сярэдняй рускай школы. Актыўна ўдзельнічае ў мастацкай самадзейнасці. На ўрачыстым вечары 8-га лістапада яна выступіць з дакладам аб жыцці дзяцей у Савецкім Саюзе. Яна будзе гаварыць аб сваім шчасці і аб шчасці многіх дзяцей, для якіх сацыялістычная краіна стала сапраўднай мацер'ю.

А вось беларускі хлопчык Васіль Жук. Яму 11 год. Бацькі ён не памятае. Маці памерла 6 год таму назад. Ён жыў у кулака ў вёсцы Міклашоўцы, на Скідальшчыне. Пасвіў жывёлу, забаўляў дзяцей гаспадара. Неахвотна расказвае ён аб сваім ранейшым жыцці. Скажа слова — і на вачах выступаюць слёзы. Аб гэтым жыцці можна здагадвацца па тым выгляду, з якім прыбыў ён у дзіцячы дом два месяцы таму назад. Босы, апрануты ў рызманы, праз якія прасвечвала бруднае, ніколі не мытае цела, з гнойнымі балячкамі на галаве, ён быў падобен на ваўчанё: настолькі быў ён забіты, запужаны, адзічэлы.

У дзіцячым доме Васілёк навучыўся смяяцца, упершыню сустрэўшы ласку. За два месяцы ён стаў непазнавальным: заметна папаўнеў, пасвятлеў колер скуры, з галоўкі зніклі гнойныя балячкі.

Васілёк упершыню сеў за кніжку. Ён вучань першага класа. Ён вельмі стараецца і многаму ўжо навучыўся. Васілёк пазнаў сяброўства, ужо адчувае сябе членам дружнага калектыва.

Перад Васільком адкрыўся шырокі, светлы жыццёвы шлях і ён павольна, можа нават нясмела, але ўступае на яго не як сірата, а як роўнапраўны маленькі грамадзянін, як поўнакроўнае савецкае дзіця.

Да гадавіны Вялікага Кастрычніка ў дзіцячым доме выпушчан спецыяльны нумар насценнай газеты. 13-гадовая Сіма Шапіра піша ў сваім артыкуле:

«Гераічная Чырвоная Армія і вялікі Сталін вярнулі нам дзяцінства. Раней нас лічылі няпоўнацэннымі, на вуліцы на нас паказвалі пальцамі і гаварылі: «Гэта — сіроты». Цяпер мы адчуваем сябе роўнапраўнымі дзецьмі. Наша жыццё стала прыгожае і радаснае. Савецкая радзіма і вялікі Сталін з'яўляюцца нашымі бацькамі».

Былыя сіроты, а зараз шчаслівыя савецкія дзеці — выхаванцы дзіцячага дома — выйдуць сёння на кастрычніцкую дэманстрацыю з радаснай песняй, у якой выкажуць падзяку камуністычнай партыі, сацыялістычнай радзіме і вялікаму Сталіну за знойдзенае дзяцінства, за пачатак шчаслівага жыцця.

Т. Лясовіч.

Капіталістычны свет у 1940 годзе
(Лічбы і факты)

У 1940 годзе на вядзенне вайны і ваенныя патрэбы капіталістычны свет страціць амаль 50 мільярдаў долараў. На гэтыя сродкі маглі-б праіснаваць 100 мільёнаў чалавек на працягу цэлага года.

* * *

Ваенныя выдаткі паглынаюць львіную долю бюджэтаў імперыялістычных дзяржаў.

— У Англіі, па афіцыяльных даных, з агульнай расходнай сумы ў 3.467 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў на ваенныя патрэбы прадугледжана 2,8 мільярда.

— У Італіі ваенныя выдаткі запраектыраваны ў размеры 40 мільярдаў лір. Гэта сума нямногім меншы ўсіх дзяржаўных выдаткаў папярэдняга года.

— У Германіі ваенныя выдаткі, па даных замежнага друку, вызначаюцца ў размеры 40—44 мільярды марак.

— У Японіі з 10 мільярдаў іен агульнадзяржаўных выдаткаў 6,8 мільярда іен складаюць ваенныя.

— Кангрэс (парламент) ЗША зацвердзіў асігнаванні на ваенныя патрэбы ў бягучым годзе ў суме 12 мільярдаў долараў.

* * *

Вайна ўжо забрала сотні тысяч чалавечых жыццяў, прычыніла велізарныя разбурэнні ў ваюючых і ахопленых вайной краінах.

— За 10 месяцаў вайны ў Еўропе, па даных замежнага друку, забіта 225 тысяч чалавек, ранена—688 тысяч, узята ў палон і прапала без весткі — 2.915 тысяч.

— Патоплена з пачатку вайны звыш тысячы гандлёвых суднаў вадазмяшчэннем у 3.575 тысяч тон (па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс).

— У Бельгіі, як паведамляе бельгійскі друк, разбурана: 1.307 кіламетраў рэчных пуцей, 399 чыгуначных збудаванняў. У Брусэлі згарэла дашчэнту карыстаючаяся сусветнай вядомасцю бібліятэка ў 700 тысяч тамоў. Дзесяткі электрастанцый узарваны, разбураны поўнасцю або часткова тысячы дамоў.

— Асабліва значныя разбурэнні ў раёнах Паўночнай Францыі. Знішчаны заводы, фабрыкі, 700 чыгуначных мастоў, пладовыя сады і бурачныя палі.

* * *

Рэзультаты вайны выявіліся на ўраджаі зернавых у капіталістычных краінах Еўропы. Агульны недабор (у параўнанні з папярэднім годам) толькі па пшаніцы і жыту вылічаецца прыблізна ў 120—130 мільёнаў цэнтнераў.

— Ураджай пшаніцы ў прыдунайскіх краінах у 1940 г. быў на 41,1 проц. ніжэйшы, чым у 1939 г.

— Уведзена картачная сістэма на харчовыя тавары ў наступных краінах: Англіі, Германіі, Італіі, Швецыі, Нарвегіі, Бельгіі, Галандыі, Фінляндыі, Швейцарыі, Іспаніі.

— Рэзка абмяжована і нарміруецца спажыванне ў Венгрыі, Балгарыі, Югаславіі, Турцыі, Грэцыі.

Ва Францыі харчовае становішча выключна цяжкае. Значная частка насельніцтва галадае.

* * *

Вайна прывяла да рэзкага падаўжэння рабочага дня ў капіталістычных краінах. Не гледзячы на тое, што дзесяткі мільёнаў рабочых прызваны ў армію і ўцягнуты ў ваенную прамысловасць, беспрацоўе працягвае з'яўляцца сапраўдным бічом пралетарыята капіталістычных краін.

— У ЗША агульная колькасць беспрацоўных дасягае 10 мільёнаў чалавек. У Англіі ў жніўні 1940 г. толькі сярод застрахаваных налічвалася 836 тысяч беспрацоўных.

— У Даніі з агульнага ліку самадзейнага насельніцтва ў 1.606 тысяч чалавек у канцы жніўня 1940 г. было 100,7 тысяч беспрацоўных У Бельгіі, дзе колькасць самадзейнага насельніцтва раўняецца 3.750 тысяч чалавек, лік беспрацоўных на 31 жніўня 1940 г. складаў 445 тысяч чалавек.

* * *

Побач з рэзкім пагаршэннем становішча працоўных шалёна растуць прыбыткі капіталістаў.

— У ЗША за першае паўгоддзе 1940 г. 400 буйнейшых амерыканскіх фірм атрымалі чыстага прыбытку 649 мільёнаў долараў супроць 409 мільёнаў у першым паўгоддзі 1939 года. Аружэйныя заводы Рэмінгтон зарабілі на вайне за першае паўгоддзе 1940 г. 1.219 мільёнаў, прыбытак іх павялічыўся ў 11 разоў супроць 1939 года.

З А   Р У Б Я Ж О М

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 5 лістапада. (ТАСС). У зводцы вярхоўнага камандавання германскай арміі паведамляецца, што не гледзячы на неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы, германская авіяцыя 4 лістапада працягвала бамбардыраваць тэрыторыю Англіі, Шатландыі і галоўным чынам Лондан. З 19 гадзін да 6 гадзін 30 мінут раніцы германскія бамбардыроўшчыкі скінулі на англійскую сталіцу ў агульнай складанасці звыш 1.500 бомб.

4 лістапада і ў ноч на 5 германскія бамбардыроўшчыкі прадпрынялі вялікую колькасць налётаў на другія важныя ў ваенных адносінах аб'екты, на аэрадромы, прамысловыя і чыгуначныя збудаванні, склады боепрыпасаў і ваенныя баракі. Пры гэтым у Уоцішэме і Фордзе бомбы зноў папалі ў ангары, а таксама разбурылі вялікую колькасць самалётаў на зямлі. Пасля начных налётаў на Кавентры і Ліверпуль было заўважана многа ўзрываў і пажараў.

Мініраванне англійскіх портаў працягваецца. Самалёты праціўніка не паяўляліся над тэрыторыяй Германіі. Збіт 1 англійскі самалёт, які спрабаваў наблізіцца да ўзбярэжжа Ла-Манша. Германская авіяцыя страціла 1 самалёт.

Англійскія і германскія страты за кастрычнік месяц

БЕРЛІН, 5 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што на працягу кастрычніка месяца англійскія страты, згодна даных асведамленых германскіх кругоў, склалі 419 самалётаў. У даным выпадку гутарка ідзе толькі аб бяссрэчна ўстаноўленых стратах. Агенцтва заяўляе, што ў сапраўднасці колькасць іх павінна быць вышэй. Германія ў кастрычніку месяцы страціла 138 самалётаў.

ДА РОСПУСКУ ТАНЖЭРСКАГА МІЖНАРОДНАГА КАМІТЭТА

БЕРЛІН, 5 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае ў сувязі з роспускам танжэрскага міжнароднага камітэта каментарыі мадрыдскага друку па гэтаму пытанню. «Мадрыдскі друк канстатыруе,—піша агенцтва,—што новае распараджэнне азначае завяршэнне акупацыі Танжэрскай зоны Іспаніяй, зробленай 14 чэрвеня гэтага года, і ўключэнне гэтай зоны ў састаў Іспаніі. Такім чынам Танжэр канчаткова перастаў быць міжнароднай зонай.

Грэка-італьянская вайна

НЬЮ-ЁРК, 5 лістапада. (ТАСС). Як перадае белградскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, грэчаская артылерыя працягвае абстрэл Корчы. Асобы, прыбыўшыя з Корчы, паведамляюць, што адтуль эвакуіруюцца сем'і ўсіх італьянскіх і албанскіх афіцыяльных асоб. Грэчаскія войскі знаходзяцца ў 6 мілях ад Корчы і пагражаюць адрэзаць італьянскую дывізію. Па маючыхся звестках, працягвае карэспандэнт, італьянцы ў спешным парадку перакідваюць падмацаванні і мноства танкаў у раён Корчы.

Заява італьянскіх афіцыяльных кругоў

БЕРЛІН, 5 лістапада. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, «у сувязі з чуткамі, распаўсюджваючыміся за мяжой аб якімсьці ўстанаўленні кантакта з мэтай урэгуліравання італа-грэчаскага канфлікта, у італьянскіх афіцыяльных кругах заяўляюць, што, паколькі ваенныя аперацыі сталі неабходнымі пасля адхілення італьянскага ўльтыматума, абстаноўка магла змяніцца толькі ваенным шляхам, г. зн. пасля спынення грэчаскага супраціўлення супроць акупацыі некаторых баз, якія патрабуе Італія, або ў ходзе развіцця самых аперацый».

ЧАСТКОВАЯ ЭВАКУАЦЫЯ САЛОНІК

БЕЛГРАД, 5 лістапада. (ТАСС). Як перадае югаслаўская газета «Праўда», з Салонік пачалася эвакуацыя жанчын і дзяцей, бо горад часта падпадае нападам італьянскіх самалётаў.

ПРЫГАВОР НЕРУ

ЛОНДАН, 5 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Рэйтэр з Горакура, — Неру — адзін з кіраўнікоў індыйскага нацыянальнага кангрэса прыгаворан да 4 год турэмнага зняволення.

АНГЛА-ІТАЛЬЯНСКАЯ ВАЙНА

ЛОНДАН, 5 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у апублікаваным у Каіры (Егіпет) афіцыяльным паведамленні гаворыцца, што абстаноўка на франтах за 4 лістапада не змянілася.

Англійскае марское міністэрства аб'явіла аб патапленні двух італьянскіх падводных лодак.

У паведамленні з Найробі гаворыцца, што паўднёва-афрыканскія паветраныя сілы збілі 2 італьянскіх самалёты тыпу «Савойя» і 1 самалёт тыпу «Капроні». 11 італьянскіх лётчыкаў узяты ў палон.

Нам. адказнага рэдактара Г. М. КУЗНЯЦОЎ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16 10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—3034. Тыраж — 10.000 экз. Друкарня Беластокдрук